Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ: НОВАЕ Ў ДАСЛЕДАВАННІ І ВЫКЛАДАННІ

*Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі*

**27 сакавіка 1999 года**

**Частка 1**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск 1999

Важным этапам беларускай нацыянальнай школы можна лічыць перыяд беларусізацыі 20-х гг. Афіцыйна яна была распачата Пастановай ЦВК БССР ад 15 ліпеня 1924 г. «Аб практычных мерапрыемствах па правядзенню нацыянальнай палітыкі». Але беларускія нацыянальныя школы сталі ўзнікаць па ініцыятыве Наркамасветы, прагрэсіўнай інтэлігенцыі пасля абвяшчэння БССР. Да 1928 г. каля 80% школ было пераведзена на беларускую мову навучання. Разам з тым адчыняліся школы з рускай мовай выкладання для прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей: рускай, польскай, яўрэйскай, украінскай і інш.

**А. А. Каваленя**

## НЕКАТОРЫЯ ВЫНІКІ ДАСЛЕДЧАЙ ПРАЦЫ АДНОСНА ДЗЕЙНАСЦІ ПРАГЕРМАНСКІХ МАЛАДЗЁЖНЫХ САЮЗАЎ (1941—1944 гг.)

Вывучэнне шырокага кола апублікаваных крыніц, архіўных дакументаў і матэрыялаў дазволіла аўтару зрабіць наступныя вывады:

*Па-першае.* Сацыяльна-палітычнае жыццё ў СССР, сістэма міждзяржаўных адносін, што склаліся напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, стварылі аб'ектыўныя перадумовы для фарміравання ў маладзежным асяроддзі розных светапоглядаў. Тым не менш у большай часткі падрастаючага пакалення Беларусі, выхаванага пры савецкай уладзе, заставаліся прывабнымі камуністычныя ідэалы, што пацвярджае яго масавы ўдзел у патрыятычным антыгерманскім руху.

*Па-другое.* Паражэнні войск Чырвонай Арміі ў пачатку вайны, імклівы захоп германскім вермахтам тэрыторыі Беларусі, жорсткі акупацыйны рэжым, масіраваная ідэалагічна-прапагандысцкая апрацоўка не зламалі волю беларускага народа да супраціўлення рабаўнікам.

Разам з тым акрэсленая сітуацыя пэўным чынам адбівалася на псіхалагічным стане насельніцтва, адмоўна ўплывала на яго маральна-палітычнае адзінства: узмацніўся працэс ідэалагічнага размежавання ў грамадстве, у тым ліку і ў маладзежным асяроддзі. Усе гэта з'явілася спрыяльнай маральна-псіхалагічнай падставай для стварэння прагерманскі арыентаваных маладзежных саюзаў.

*Па-трэцяе.* Палітычныя колы Трэцяга Рэйха, якія былі абцяжараны нацыянал-сацыялістычнай ідэалогіяй і знаходзіліся ў «палоне» планаў маланкавай вайны, не праяўлялі належных намаганняў у выпрацоўцы палітычнай стратэгіі ў адносінах да падрастаючага пакалення Ўсходніх



акупіраваных тэрыторый. Стаўка рабілася на грубую сілу, масавую жорсткасць, фізічную расправу з носьбітамі камуністычных ідэй, мэтанакіраваную ідэалагічна-прапагандысцкую апрацоўку насельніцтва пад сцягам «вызвалення Беларусі з-пад уплыву жыда-бальшавізму».

Дадзеная палітыка павінна была матэрыялізавацца ў лаяльнасць моладзі да германскага акупацыйнага рэжыму, забяспечыць успрыняцце падрастаючым пакаленнем нацыянал-сацыялістычных ідэалаў і тым самым садзейнічаць яго супрацоўніцтву на карысць Трэцяга Рэйха.

*Па-чацвертае.* Крах планаў маланкавай вайны, напружаныя ваенна-эканамічныя абставіны ўнутры Германіі вымусілі гітлераўскае кіраўніцтва актыўна шукаць сацыяльную апору ў асяроддзі насельніцтва ўсходніх акупіраваных тэрыторый.

Стаўка рабілася, у першую чаргу, на падрастаючае пакаленне, якое ў сілу сваіх узростава-псіхалагічных асаблівасцей магло хутчэй вызначыць ідэал сваей асобы ў будучым — успрыняць нацыянал-сацыялістычны светапогляд і стаць на шлях супрацоўніцтва з агрэсарам. Нацысцкія палітычныя колы лічылі, што магчымым «інструментам» у вырашэнні пастаўленай задачы павінны стаць антысавецкія маладзежныя саюзы, дзейнасць якіх неабходна цалкам падпарадкаваць германскаму імперскаму маладзежнаму кіраўніцтву Гітлер-югенд.

Аднак аўтары дадзенай канцэпцыі не змаглі выпрацаваць яскрава акрэсленай стратэгічнай лініі ў адносінах да падрастаючага пакалення Ўсходніх тэрыторый. Прымаемыя рашэнні насілі спантанна-супярэчлівы характар, што яскрава адлюстроўвала абсурднасць нацысцкай ідэалогіі, і ўзмацняліся складанасцю ваенна-эканамічнага і палітычнага становішча Германіі. Розным дзяржаўным ведамствам адначасова даваліся дырэктывы па мабілізацыі моладзі на працу ў германскі рэйх. Адны з іх павінны былі ажыццяўляць набор на добраахвотных пачатках, сілавыя структуры — на прымусовых, карныя органы абавязваліся праводзіць масавыя акцыі па «уміратварэнню» насельніцтва.

*Па-пятае.* Германскія лідэры пад націскам абставін,і перш за ўсе пад уплывам развіцця наступальных аперацый Чырвонай Арміі, далі дазвол на арганізацыю на ўсходніх захопленых тэрыторыях нацыянальных маладзежных саюзаў.

На акупіраванай Беларусі ў чэрвені 1943 г. быў абвешчаны Саюз Беларускай моладзі, а ў ліпені таго ж года генеральны камісар В. Кубэ выдаў загад аб стварэнні Беларускай службы бацькаўшчыны. У маі 1944 г. арганізоўваецца Саюз рускай моладзі і Саюз татарскай моладзі, а яшчэ раней, у красавіку 1944 г., — Саюз барацьбы супраць бальшавізму. У будучым на



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Саюз барацьбы супраць бальшавізму ўскладвалася задача аб'яднаць пад яго сцягам усе маладзежныя суполкі з мэтай стварыць інтэрнацыянальную маладзежную арганізацыю.

Распрацоўваючы праграму на перспектыву, нацысцкія аналітыкі меркавалі, што стварэнне маладзежных саюзаў дазволіць вырашыць, як мінімум, дзве ўзаемазвязаныя задачы. Маладзежныя арганізацыі, з аднаго боку, павінны былі выконваць ролю кіруючага цэнтра па добраахвотнай мабілізацыі і адпраўцы юнакоў і дзяўчат на працу ў Германію, а з другога — адцягнуць моладзь ад удзелу ў партызанскім руху і патрыятычным падполлі.

У кантэксце праблемы стварэння розных нацыянальных партый, саюзаў і аб'яднанняў, у тым ліку і маладзежных саюзаў, нацысты вылучалі важную мэту: прадэманстраваць міжнароднай супольнасці падтрымку сваіх палітычных намаганняў з боку мясцовых нацыянальных сіл акупіраваных краін у вызваленні з-пад «іуда-бальшавізму». З гэтай нагоды пры ўдзеле германскіх спецслужбаў стваралася ўражанне і нават бачнасць апазіцыйнасці мясцовых арганізацый да акупацыйнага рэжыму.

*Па-шостае.* Нягледзячы на тое што маладзежным саюзам знешне надавалася прывабнае нацыянальна-дзяржаўнае аблічча, іх сутнасць была напоўнена прагерманскім зместам, у аснове якога ляжала нацыянал-сацыялістычная ідэалогія. Саюзы працавалі пад непасрэдным кіраўніцтвам германскага маладзежнага саюза Гітлер-югенд і падпарадкоўваліся на месцах германскай грамадзянскай і ваеннай уладзе.

Структурнае будаўніцтва ў большасці капіравалася з арганізацыйных форм Гітлер-югенда. У арганізацыях СБМ, СТМ, СБСБ, СРМ разгарнулася актыўнае, напоўненае канкрэтным зместам унутрысаюзнае жыццё. Узнік добракіруемы механізм упраўлення арганізацыямі, у аснову якога быў пакладзены жорсткі прынцып фюрэрства, паўваенная дысцыпліна і разгалінаваная сістэма кіруючага апарата.

З мэтай падтрымаць функцыянаванне маладзежных саюзаў на пэўным узроўні ў кароткі тэрмін была створана сістэма падрыхтоўкі кіруючага звяна, наладжаны выпуск інструктыўна-метадычных выданняў.

*Па-семае.* Практычная дзейнасць маладзежных арганізацый засноўвалася на ідэях германскага нацыянал-сацыялізму, які разглядаўся як важнейшы палітычны сродак забеспячэння лаяльнасці моладзі да рэжыму, яе паспяховага ўцягнення ў ваенна-гаспадарчыя работы, недапушчэння ўплыву камуністычнай ідэалогіі.

Ідэалагічнаму ўздзеянню на моладзь былі падпарадкаваны сродкі масавай інфармацыі: друк, наглядная агітацыя, радые, кіно, работа культурна-асветных устаноў. Безупынная апрацоўка падрастаючага



пакалення набыла шырокі і мэтанакіраваны характар, асабліва сярод членаў прагерманскіх маладзежных саюзаў. Можна сцвярджаць, што такому ідэалагічнаму ўціску, як гэта мела месца ў іх асяроддзі, не падвяргалася ні адна сацыяльная група насельніцтва акупіраванай Беларусі.

*Па-восьмае.* Выкарыстанне сродкаў ідэалагічнага ўздзеяння, маральнага і матэрыяльнага заахвочвання, ваенна-паліцэйскіх сіл, прывабных нацыянальна-дзяржаўных ідэй дапамаглі праваднікам германскага нацызму ўцягнуць у сферу палітычных, ваенна-эканамічных інтарэсаў некаторую частку беларускай моладзі. Разам з тым адсутнасць шырокай сацыяльнай апоры і падтрымкі ў беларускім грамадстве, недахоп часу не дазволілі разгарнуць дзейнасць Саюзу рускай моладзі, Саюзу татарскай моладзі, Саюзу барацьбы супраць бальшавізму. Дадзеныя саюзы толькі паспелі абвясціць аб сваім заснаванні і атрымаць некаторы палітычны рэзананс, а практычнага ўздзеяння на насельніцтва, асабліва беларускай нацыянальнасці, яны не мелі. Іх дзейнасць распаўсюджвалася у асноўным на моладзь Рускай нацыянальнай народнай арміі, іншых вайскова-паліцэйскіх фарміраванняў, а таксама тых расійскіх бежанцаў, якія актыўна супрацоўнічалі з германскімі акупацыйнымі ўладамі. Немалаважным таксама быў факт, што беларускія нацыянальна-калабарацыяніцкія сілы усяляк супрацьстаялі пранікненню ў кіруючыя структуры акупацыйнай улады расійскага, польскага і татарскага нацыянальнага элемента.

Найбольшым аўтарытэтам сярод часткі беларускай моладзі карыстаўся Саюз беларускай моладзі. Асноўнай сацыяльнай апорай СБМ былі прадстаўнікі той часткі грамадства, якія з першых дзен вайны сталі на шлях супрацоўніцтва з германскім агрэсарам і былі цесна звязаны з акупацыйным рэжымам.

Аднак станоўчай разбудове СБМ не садзейнічала стратэгічная палітыка лідэраў Трэцяга Рэйха і практыка жыццебудаўніцтва на акупіраваных тэрыторыях. Імкненне спалучыць беларускую нацыянальную ідэю са штодзенным насаджэннем жорсткасці, насілля і беззаконнасці ў адсутнасці яскрава-акрэсленых перспектыў нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва не магло прынесці станоўчых вынікаў нават пры самых прывабных абяцаннях.

Дададзім, што пад уздзеяннем перамог Чырвонай Арміі, патрыятычнага руху супраць акупантаў памяншалася колькаць тых, хто спадзяваўся рэалізаваць пэўныя нацыянальна-дзяржаўныя намеры пры іх падтрымцы. Да таго ж патрыеты разгарнулі сярод насельніцтва захопленай тэрыторыі Беларусі шырокую агітацыйна-прапагандысцкую і асветніцкую работу, прыбягалі да [illegible] барацьбы з лідэрамі прагерманскіх маладзежных саюзаў.

Моладзь у сваей большасці станавілася на шлях барацьбы з агрэсарам, ставілася варожа да антысавецкіх маладзежных саюзаў. Яскрава пра гэта



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

сведчыць факт, што на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі барацьбу з акупантамі вялі 80 тысяч партызан-камсамольцаў і 20 тысяч маладых падпольшчыкаў, аб'яднаных больш чым у 5800 арганізацый і груп, у той час як у радах Саюза беларускай моладзі налічвалася каля 12 тысяч чалавек, Саюза барацьбы супраць бальшавізму — каля тысячы, саюзаў рускай і татарскай моладзі — па некалькі соцень юнакоў і дзяўчат. Перавага відавочная.

**И. В. Карпенко**

## ИЗ ИСТОРИИ КОМСОМОЛЬСКОЙ ОРГАНИЗАЦИИ МИНСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО ПЕДАГОГИЧЕСКОГО ИНСТИТУТА им. М. ГОРЬКОГО

29 октября 1998 г. исполнилось 80 лет Всесоюзному Ленинскому Коммунистическому Союзу молодежи. У комсомола славная история, богатые традиции. Для одного поколения — это были революция, гражданская война и первые пятилетки, для других — Великая Отечественная война, юность третьих выпала на героические годы послевоенного восстановления и освоения целины. История комсомольской организации Минского государственного педагогического института имени М. Горького неразрывно связана с историей ВЛКСМ, историей становления и развития высшей школы в Беларуси.

Комсомольская организация института ведет свою историю с момента создания в 1924 г. на базе педагогического факультета БГУ первичной организации, которая насчитывала в своих рядах 75 комсомольцев. С выделением педфака БГУ в 1931 г. в самостоятельный Высший педагогический институт начинается новый этап истории комсомольской организации.

К сожалению, восстановить полную историю комсомольской организации института не представляется возможным: архивные материалы 1931—1941 гг. в большинстве своем были уничтожены во время Великой Отечественной войны. Основой для изучения истории комсомольской организации МГПИ им. М. Горького служат архивные материалы 1944—1989 гг.

Особое место в истории комсомольской организации МГПИ им. М. Горького занимает период Великой Отечественной войны. Студенты и преподаватели института свято выполнили свой долг перед Родиной. На разных фронтах, в подполье и в партизанских отрядах они сражались с врагом. Активное участие в подпольной борьбе против немецко-фашистских захватчиков приняла студентка, комсомолка О. И. Кухто. Она помогла группе разведчиков Красной Армии обосноваться в Минске

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ